ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
15
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 31 (1444)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

БЮРО ПАРТКОМА

на чарговым пасяджэнні разгледзела работу школ маладых камуністаў. Абмеркавана таксама выкананне пастановы бюро парткома ад 28 сакавіка 1984 года «Аб мерах па паляпшэнню прафілактыкі правапарушэнняў у калектывах падраздзяленняў універсітэта».

З. АЛЯКСАНДРАВА.

ТВОРЧАЯ СУСТРЭЧА

з артыстам кіно Сяргеем Якаўлевым прайшла ў актавай зале універсітэта. Госць захапляюча расказаў аб сваім творчым лёсе, аб асноўных і найбольш удалых ролях, падзяліўся задумамі і планамі на будучае.

У канцы сустрэчы дэманстраваліся фрагменты з кінастужак «Камуніст», «Цені знікаюць апоўдні» і іншых.

М. ТАРАСАВА,
інструктар студэнцкага клуба.

У ПАДШЭФНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

Уздзенскага раёна пабываў універсітэцкі фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш». Самадзейныя артысты выступілі з цікавай і змястоўнай праграмай перад працоўнымі Уздзеншчыны. Канцэрт удаўся. Удзельнікі ансамбля атрымалі падзяку Уздзенскага райкома партыі і Міжсаюзнага дома самадзейнай творчасці працоўных.

Э. АНІСЕНКА,
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

ЦЫКЛ ЛЕКЦЫЙ

на тэму «Асімптатычныя ацэнкі складанасці кіруючых сістэм» арганізаваны ў БДУ імя У. І. Леніна з 12 па 17 лістапада. Іх чытае член-карэспандэнт АН СССР, лаўрэат Ленінскай прэміі, прафесар А. Б. Лупанаў.

І. КАЖЭЎНІКАВА.

ЧАРГОВЫ ЗАЕЗД

у прафілакторый БДУ пачаўся 14—15 лістапада. Студэнцкі прафком запрашае жадаючых адпачыць і паправіць сваё здароўе. Да паслуг студэнтаў — выдатна абсталяваныя лячэбныя кабінеты, сталовая, добрыя ўмовы для падрыхтоўкі да заняткаў, кваліфікаваны медыцынскі персанал, цікавы адпачынак.

З. МІХНЕВІЧ.

ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

АРЫЕНЦІР — КАНЧАТКОВЫ ВЫНІК

Нядаўна ў БДУ імя У. І. Леніна прайшла XXVI справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў. На ёй прысутнічалі загадчык сектара ЦК КПБ В. І. Пракошын, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, загадчык аддзела гаркома КПБ І. Ф. Клімаў, інструктар Маскоўскага РК КПБ А. М. Мішын, сакратар Мінскага АК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў Я. Д. Пашкевіч.

З дакладам выступіў старшыня прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў У. Т. Шалатонін.

У спрэчках выступілі Л. І. Кісялеўскі — рэктар універсітэта, А. А. Мінько — намеснік дырэктара НДІ ПФП, А. А. Дудко — дацэнт кафедры філасофіі гуманітарных факультэтаў, І. В. Марчанка — старшыня савета ветэранаў вайны універсітэта і іншыя.

У СПРАВАЗДАЧНЫ перыяд у сваёй рабоце прафком абапіраўся на шырокі прафсаюзны актыў, які налічвае больш за 1.700 чалавек. Прафсаюзныя актывісты універсітэта — гэта не толькі выбарныя работнікі. У большасці гэта члены прафсаюза, добраахвотныя памочнікі выбарных прафсаюзных органаў, якія маюць грамадскія даручэнні па розных напрамках прафсаюзнай работы: грамадскія інструктары па ахове працы і тэхніцы бяспекі, інспектары грамадскага харчавання, кіраўнікі і арганізатары гурткоў, самадзейных ансамбляў, тэатраў, грамадскія трэнеры па спорту, арганізатары выставак, тэматычных вечароў, члены конкурсных камісій і г. д. Гэта дазволіла прафкому супрацоўнікаў далучыць да кіравання справамі універсітэта, яго факультэцкіх, інстытуцкіх калектываў трэць членаў прафсаюза.

У канцы 1982 года прафком арганізаваў школу прафсаюзнага актыву ў саставе 13 вучэбных груп — па асноўных напрамках прафсаюзнай работы. За гэтыя гады школу закончылі 620 актывістаў, якія авалодалі ведамі асноўных форм і метадаў работы. Зараз школа знаходзіцца на этапе станаўлення і развіцця. Патрэбна дабіцца большай актыўнасці і дысцыплінаванасці слухачоў школы, палепшыць падбор лектараў, абнавіць тэматычныя планы заняткаў. Пажадана было б стварыць спецыяльны кабінет для заняткаў школы, абсталяваны наглядным дапаможнікамі, сродкамі агітацыі і вучэбнай тэхнікай.

У справаздачны перыяд вытворча-масавая работа прафкома праводзілася сумесна з адміністрацыяй, партыйным камітэтам, прафгрупамі і прафсаюзнымі бюро. Рэзультаты гэтага супрацоўніцтва можна прасачыць па даных, якія адносяцца да важнейшых вынікаў дзейнасці універсітэта.

За няпоўныя чатыры гады XI пяцігодкі выдадзена 880 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, з іх з грыфам міністэрства больш за 80 падручнікаў. Гэта нядрэнны ўклад у павышэнне якасці выкладання агульных і спецыяльных дысцыплін.

На сённяшні дзень з пачатку пяцігодкі аспірантамі, выкладчыкамі і навуковымі супрацоўнікамі абаронена 305 кандыдацкіх дысертацый, што сведчыць аб росце кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў.

Добрыя змены адбыліся і ў падрыхтоўцы дактароў навук. Калі за ўсю апошнюю пяцігодку было абаронена 13 доктарскіх дысертацый, то зараз дактарамі навук сталі 24 чалавекі, у тым ліку толькі ў бягучым годзе 8. Аднак гэта яшчэ недастаткова высокі паказчык для вядучай ВНУ рэспублікі.

Значна ўзрасла эфектыўнасць навукова-даследчых работ. Яшчэ у 70-х гадах эканамічны эфект ад укаранення рэзультатаў завершаных навуковых работ складаў 5—6 млн. рублёў у год, а ў 80-я гады ён перавысіў 20 млн. руб.

Патрэбна адзначыць арганізатарскую работу прафсаюзнага камітэта, яго вытворча-масавай камісіі і агульнаўніверсітэцкай камісіі па сацыялістычнаму спаборніцтву за дасягненне высокіх канчатковых вытворчых паказчыкаў. Прынятыя сацыялістычныя абавязацельствы на 1981, 1982 і 1983 гады не толькі выконваліся, але і перавыконваліся.

З кожным годам удасканальваецца сістэма арганізацыі і падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва. У прыватнасці, абноўлены ўмовы спаборніцтва паміж факультэтамі і кафедрамі грамадскіх навук. Большасць прафсаюзных бюро і вытворчых падраздзяленняў творча і адказна ставяцца да арганізацыі і правядзення сацспаборніцтва ў калектывах. Тут патрэбна адзначыць актыўнасць прафбюро кафедраў грамадскіх навук, факультэта радыёфізікі і электронікі, юрыдычнага факультэта, а таксама кіравання.

Каштоўны вопыт па арганізацыі індывідуальнага спаборніцтва назапашаны кафедрай марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, кафедрай ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі.

Заслугоўвае адабрэння і работа па развіццю сацыялістычнага спаборніцтва ў НДІ ПФП і СКТБ з ВВ—неаднаразовых пераможцаў рэспубліканскага і ўсесаюзнага спаборніцтваў сярод НДІ і вытворчых падраздзяленняў ВНУ.

Вялікае месца ў справаздачны перыяд прафсаюзны камітэт адводзіў паляпшэнню жыллёвых умоў супрацоўнікаў універсітэта, пастаянная ўвага ўдзялялася пытанням, звязаным з аховай працы, тэхнікай бяспекі, вытворчай санітарыяй. Сумесна з камісіямі прафсаюзных бюро вялася значная прафілактычная работа, асабліва ў тых падраздзяленнях, дзе шкодныя ўмовы працы. Праводзілася праверка тэхнікі бяспекі на рабочых месцах у лабараторыях хімічнага, біялагічнага, фізічнага, геаграфічнага факультэтаў, факультэта радыёфізікі і электронікі, друкарні, вучэбных майстэрнях і г. д. Прыемна тое, што ў 1983 годзе па выніках Усесаюзнага грамадскага агляду культуры вытворчасці і бяспекі працы наш універсітэт заняў першае месца сярод ВНУ рэспублікі і краіны.

Добра папрацавалі ў справаздачны перыяд камісія грамадскага харчавання, культурна-масавая і спартыўна-масавая камісіі. Вялікая ўвага ўдзялялася пытанням, звязаным з арганізацыяй адпачынку і санаторна-курортнага лячэння.

Такія асноўныя вынікі дзейнасці прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў за справаздачны перыяд. Але ў рабоце прафкома яшчэ шмат недахопаў, нявырашаных пытанняў. Неабходна звярнуць увагу на арганізацыю індывідуальнага спаборніцтва ў маштабах кафедраў, аддзелаў, лабараторый, на павышэнне яго эфектыўнасці. Вымушае жадаць лепшага і работа культурна-масавай камісіі.

На справаздачна-выбарнай прафсаюзнай канферэнцыі супрацоўнікаў выбраны новы састаў прафкома універсітэта. Членамі прэзідыума прафкома выбраны **М. М. Бражнікаў, У. П. Гольцаў, М. І. Зотаў, Г. В. Мацвееў, У. І. Мікуловіч, М. М. Полазаў, Л. П. Сямёнава, М. І. Юрчук.** У састаў прафкома супрацоўнікаў увайшлі таксама **Э. А. Анемпадзістава, Г. У. Барташэвіч, У. С. Багданаў, Е. С. Бункевіч, Н. П. Вашчылава, М. В. Грыц, А. А. Дудко, П. І. Зялінскі, А. К. Іванова, М. Р. Каваленка, А. М. Курбацкі, В. М. Лукавецкая, В. Ф. Міхалевіч, А. В. Махнач, А. В. Паўлаў, І. І. Пірожнік, Б. А. Плотнікаў, А. Ц. Панамарэнка, Л. А. Прыходзька, Я. А. Свірскі, А. І. Серафімовіч, Б. П. Усцінаў, В. У. Урбан.**

Старшынёй прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў і членам прэзідыума выбраны **У. Т. Шалатонін,** намеснікам старшыні і членам прэзідыума — **А. М. Рухля.**

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

НА ЗДЫМКАХ: у час работы канферэнцыі.

Фота А. Валошына.

НА МОВЕ ДРУЖБЫ

17 лістапада на нашай планеце адзначаецца Міжнародны дзень студэнтаў. У гэты дзень ва ўсім свеце яшчэ мацней гучыць голас міру, дружбы, салідарнасці, які аб'ядноўвае ўсіх людзей добрай волі.

З 1961 ГОДА Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна штогод прымае ў сваю дружную інтэрнацыянальную сям'ю пасланцоў многіх народаў нашай планеты. У сценах універсітэта разам з савецкімі студэнтамі вучыцца больш за 900 студэнтаў і аспірантаў з 79 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Шмат цікавых мерапрыемстваў праходзіць ва універсітэце. Арганізуюць і праводзяць іх нашы актывісты. Сёння мы можам ганарыцца Аляксандрам Самуйлічам, Хан Мухамедам, Жаннай Жмайлік, Мусаідам Зайфулой, Людмілай Кулініч, Ахмедам Алі Мухамедам і іншымі. Усім разам — любая справа пад сілу: і вечар інтэрнацыянальнай дружбы, і суботнік, і дыскусія... Прыемна бачыць, што грамадская работа для многіх замежных навучэнцаў стала неабходнасцю. І таму жыццё наша стала намнога больш змястоўным і цікавым. Хочацца, каб характэрнымі рысамі ўсіх студэнтаў універсітэта былі незаспакоенасць, камсамольскі запал, актыўнасць.

У рабоце па інтэрнацыянальнаму выхаванню кожны дзень паўстаюць новыя задачы. Яны заўсёды ёсць і будуць. Вырашаць іх—наш інтэрнацыянальны абавязак.

З кожным годам расшыраюцца інтэрнацыянальныя сувязі нашага універсітэта. Ужо традыцыйным стаў абмен студэнцкімі будаўнічымі атрадамі БДУ імя У. І. Леніна з Йенскім універсітэтам імя Ф. Шылера (ГДР) і Ямбольскім педагагічным інстытутам імя Д. Благоева (НРБ). Савецкія студэнты выдатна працуюць у ГДР і НРБ, а на беларускай зямлі — нямецкія і балгарскія студэнты. Яны працуюць разам не больш за месяц, а дружба, што нарадзілася ў атрадзе, застаецца на доўгія гады.

У музеі універсітэта створана сцяна памяці. З фотаздымкаў на нас глядзяць студэнты універсітэта, якія загінулі ў полымі Вялікай Айчыннай вайны. У іх вачах — заклік да студэнтаў 80-х, да тых, хто будзе працаваць і змагацца за захаванне міру, каб ніколі не паўтарыліся Хатынь, Лідзіца, Сангмі...

Уклад калектыву нашага універсітэта ў барацьбу за захаванне міру—12 студэнцкіх атрадаў бязвыплатнай працы. Гэта — інтэрнацыянальныя суботнікі, дні ўдарнай працы, мітынгі пратэсту супраць гонкі ўзбраенняў, фотавыстаўкі, якія абвінавачваюць мілітарызм.

Калі нашы замежныя таварышы паедуць на Радзіму, мы ўпэўнены, што ўсе сілы, усю энергію яны аддадуць барацьбе за шчасце сваіх народаў, справе ўмацавання міру і дружбы на зямлі.

Камітэт камсамола універсітэта будуе сваю работу з зямляцтвамі на аснове двухбаковых дагавораў аб дружбе і супрацоўніцтве. Зараз заключана 18 дагавораў паміж камітэтам камсамола і зямляцтвамі і арганізацыямі замежных навучэнцаў.

Тыдні дружбы, віктарыны, інтэрнацыянальныя суботнікі, выстаўкі — гэта толькі некаторыя формы нашага супрацоўніцтва. Сёмы год ва універсітэце працуе інтэрнацыянальны дыскусійны клуб «Палітыкус». Летам замежныя студэнты выязджаюць у саставе студэнцкіх будаўнічых атрадаў у Сібір, Пскоўскую вобласць, працуюць у Беларусі.

Інтэрнацыянальныя мерапрыемствы дапамагаюць моладзі розных кантынентаў расшыраць свой кругагляд, больш даведацца пра іншыя краіны.

У нас розны колер скуры, розная мова, розныя звычаі. Але галоўнае, што нас аб'ядноўвае, — гэта імкненне жыць у міры і дружбе.

В. ШАДУРСКІ,
намеснік сакратара камітэта камсамола па інтэрнацыянальнаму выхаванню.

УСЁ НОВЫЯ І НОВЫЯ пакаленні людзей уваходзяць у жыццё. З 4 мільярдаў насельніцтва планеты палавіну складае моладзь ва ўзросце да 25 гадоў. Моладзі належыць будучае. Гэта будучае ствараецца ўжо сёння. А ў гэтым сэнсе моладзі належыць і сучаснае.

У розных краінах перад маладымі людзьмі стаяць розныя задачы. Але разам з тым перадавую дэмакратычную моладзь аб'ядноўвае імкненне да міру, дэмакратыі, сацыяльнага прагрэсу. Аб гэтым сведчаць выступленні замежных студэнтаў, якія вучацца ў нашым універсітэце.

БОН АНЭ МАТУМОНА, Народная Рэспубліка Конга, факультэт журналістыкі:

У МАІМ жыцці адбыліся дзве падзеі, зусім не падобныя адна на адну. Але наколькі яны важныя, лічыце самі.

1978 год. Моладзь усяго свету накіравала свае погляды да Гаваны. У саставе кангалезскай дэлегацыі, што прыбыла на XI фестываль моладзі і студэнтаў у сталіцу сацыялістычнай Кубы, быў і я. У мяне была вельмі адказная місія — расказаць у сваіх рэпартажах, замалёўках аб усім, што адбывалася на фестывалі, моладзі Народнай Рэспублікі Конга. За час фестывалю, бываючы на розных мерапрыемствах, размаўляючы з людзьмі, я заўважыў дзіўную рэч: сустракаюцца зусім незнаёмыя людзі, але яны знаходзяць агульную мову — мову дружбы.

А калі кожная дэлегацыя пачала выступаць з канцэртнай праграмай і над Гаванай зазвінелі песні народаў свету, то і тут знайшлося агульнае: моладзі ўсяго свету патрэбен мір.

І я далучаю свой голас да патрабавання: «Мір — планеце Зямля!». Я хачу, каб у міры раслі мае дзеці.

Другая падзея, якой я надаю асаблівае значэнне, гэта тое, што тут, у Савецкім Саюзе, у мяне нарадзілася трое блізнятак-дзяўчынак. І не ведаю, як бы мы справіліся з малымі, каб не было побач нашых землякоў, савецкіх сяброў. Колькі сіл і энергіі аддала нашым дзецям урач Галіна Міхайлаўна Пяшко. Галіна — так назвалі мы адну са сваіх дачок. Вельмі хочам, каб выросла яна такім жа цудоўным чалавекам, як Галіна Міхайлаўна.

ЭНРЫКА СІЛЬВА МОЛІНА, Нікарагуа, механіка-матэматычны факультэт:

НЯСПЫННА бяжыць час. У віхуры студэнцкага жыцця не паспяваеш заўважыць, як праходзяць дні, тыдні... Вось і я ўжо трэцякурснік механіка-матэматычнага факультэта. Але і зараз добра памятаю тыя мінуты чакання, калі пасля заканчэння школы разам з сябрам напісаў заяву: жадаю працягваць вучобу далей. Я шчаслівы, што Саюз сандзінісцкай моладзі імя 19 чэрвеня накіраваў мяне іменна сюды, у Савецкі Саюз. Цяжка перадаць мой душэўны стан, калі я пакідаў радзіму. Дома заставаліся бацькі, сябры, увесь нікарагуанскі народ. Яны пачыналі будаўніцтва новага жыцця, ім патрэбны былі маладыя, дужыя рукі. Гэта спыняла. Але ў той жа час я падумаў: не абысціся маёй рэспубліцы без кваліфікаваных спецыялістаў. Так я паехаў у СССР. Спачатку было вельмі цяжка. І не толькі таму, што не ведаў самых простых слоў па-рускі—«мама», «сонца», «хлеб», але і таму, што ніяк не мог прывыкнуць да мірнай цішыні, да стваральнай працы людзей, да цудоўных умоў жыцця савецкіх студэнтаў. Зараз наконт гэтага ў мяне склалася адзінае меркаванне — як добра жыць у сацыялістычным грамадстве, як добра жыць у міры.

Што я раскажу сваім сябрам, калі прыеду на радзіму? За гэтыя гады цяжка вызначыць нейкія асобныя падзеі, расказаць аб незвычайных уражаннях. Усё было цудоўна, непаўторна. Напрыклад, работа ў будатрадах. У гэтым годзе па ініцыятыве камітэта камсамола універсітэта і нікарагуанскіх студэнтаў былі створаны два інтэрнацыянальныя атрады імя Аўгуста Сесара Сандзіна і Чэ Гевары, у састаў якіх уваходзілі як замежныя, так і савецкія студэнты. На два месяцы мы паехалі ў Віцебскую вобласць, а зароблены за месяц грошы пералічылі ў Фонд абароны рэвалюцыі. Мы верым у шчаслівае будучае нашай рэспублікі, верым у брацкую дружбу нашых народаў.

ЯНА МАРОНГАВА, Чэхаславацкая Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, гістарычны факультэт:

ШЧАСЦЕ... Размаўляць на вуліцы, калі сяброўка, блакітнавокая беларуска, расказвае аб тым, якімі фарбамі можна ў пахмурны дажджлівы дзень намаляваць сонца. Калі ёсць з кім павітацца і ёсць каму расказаць пра сваю краіну. Калі паштовая паліца поўніцца добрымі вестамі...

Шчасце... Разгараецца на ўрачыстых вечарах, дзе можна разам са сваімі сябрамі аддаць свой голас супраць пагрозы вайны. І калі раптам ад адзінства думак і пачуццяў розных людзей становіцца цёпла на сэрцы.

Можа не зусім правільна я пачала свой расказ, але вельмі хочацца выказаць словы вялікай удзячнасці Беларусі, з якой звязана ўсё, што за апошнія тры гады ў маім разуменні атаясамлівалася з паняццем шчасця.

У СССР я прыехала ў жніўні 1981 пасля заканчэння сярэдняй школы. У той час я ўжо мела даволі шырокае ўяўленне аб Савецкім Саюзе з кніг, мастацкіх кінафільмаў, таму ў першыя дні ўсё мне тут здавалася знаёмым і блізкім. Але рэальнае жыццё — больш шматграннае. Кожны дзень быў для мяне святам у плане пазнання нечага новага пра Савецкую краіну, яе людзей. У гэтым мне дапамагалі мае сябры і знаёмыя. Яны кансультавалі мяне па вучэбных прадметах, падтрымлівалі ў мінуты, калі ахоплівaў смутак па роднаму дому. Садзейнічалі таму, каб я не адчувала сябе замежніцай. Стварэнне такой атмасферы вельмі важна для таго, каб у чалавека не прапала ахвота працаваць.

МАРЫЯ МАРГАРЭТ РАДРЫГЕС, Дэмакратычная Рэспубліка Сан-Таме і Прынсіпі, факультэт журналістыкі:

АБ ЧЫМ БЫ мне хацелася расказаць сваім савецкім сябрам? Вядома, аб сваёй радзіме. Дэмакратычная Рэспубліка Сан-Таме і Прынсіпі — маленькі афрыканскі астравок у Атлантычным акіяне. Насельніцтва краіны складае 100 тысяч чалавек. Былая калонія Партугаліі стала незалежнай 12 ліпеня 1975 года. З таго часу сантамійскі народ пачаў будаўніцтва новага жыцця. У авангардзе ўсіх спраў — моладзь краіны.

5 лістапада 1974 года сталіца нашай краіны Сан-Таме стала сведкай самай вялікай дэманстрацыі студэнтаў нацыянальнага ліцэя. Яны патрабавалі правесці рэформу адукацыі. Так 5 лістапада стала ў нашай краіне днём моладзі. У гэты дзень усе маладыя людзі выходзяць на вуліцы. Яны ідуць на агульны мітынг, на якім выступаюць кіраўнікі нашай арганізацыі і прэзідэнт рэспублікі. Потым юнакі і дзяўчаты ўдзельнічаюць у народных гуляннях, у канцэртах і іншых мерапрыемствах.

У гэтым годзе, адзначаючы 10-ю гадавіну нашай маладзёжнай арганізацыі, мы з гонарам гаворым аб поспехах, дасягнутых у вырашэнні задач, пастаўленых перад ёю. Мы, вядома, разумеем, што нямала цяжкасцей чакае нас наперадзе.

Цесныя сувязі існуюць паміж нашай маладзёжнай арганізацыяй і ВЛКСМ. Яны абменьваюцца дэлегацыямі, вопытам работы. Многія сантамійскія студэнты, што вучацца ў СССР, атрымліваюць стыпендыю Ленінскага камсамола.

Мы жывём жаданнем пасля вучобы вярнуцца на радзіму і зноў працягваць барацьбу за развіццё і сацыяльны прагрэс нашай Радзімы.

ХАН МУХАМЕД ЗАЎРЭДАЛАЙ, Дэмакратычная Рэспубліка Афганістан, гістарычны факультэт:

З РАННЯГА дзяцінства я зведаў цяжкасці працы, дапамагаючы бацькам. Добра ведаў не толькі словы голад, холад, але і іх сутнасць. У 197[illegible] годзе скончыў школу, а пасля перамогі рэвалюцыі 1978 года зноў вярнуўся ў школу, толькі ўжо ў якасці настаўніка. З болем у сэрцы ўспамінаю тыя радасныя гады. Радасныя, бо перад афганскім народам адкрылася новае жыццё. Успамінаючы, якія цяжкасці даводзілася перажываць, становіцца балюча. Маімі выхаванцамі былі вучні 5—6-х класаў. Дзеці часта прыходзілі на заняткі галодныя. Здавалася, якая тут можа быць вучоба, але, як маладыя парасткі да сонца, так і яны ўсе цягнуліся да навукі. А ў мяне і самога ведаў было небагата. Вось так і паявілася рашэнне вучыцца. Так я прыехаў у СССР. БДУ імя У. І. Леніна стаў для мяне не толькі месцам, дзе я змог значна павысіць свой прафесійны ўзровень, але і сапраўдным універсітэтам жыцця. Тут я змог набыць навыкі грамадскай работы.

Я жыву ў інтэрнаце № 1. Працую старастам паверха з другога курса. І магу пахваліцца: наш паверх лічыцца адным з лепшых у інтэрнаце. Работа ў савеце дружбы, у гарадскім камітэце замежных студэнтаў займае шмат часу. Але я не шкадую: жыццё маё праходзіць цікава, змястоўна. І больш таго: усё зведанае, убачанае, пачутае ў Савецкім Саюзе мне вельмі спатрэбіцца ў рабоце на радзіме.

● РЭХА ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

Сэрца аддаюць дзецям

Чацвёрты год працуе атрад бязвыплатнай працы «Маладосць», які створаны на механіка-матэматычным факультэце нашага універсітэта.

А ПАЧАЛОСЯ ўсё з таго, што камсамольцы факультэта ўзялі шэфства над дзіцячым домам № 2 г. Мінска. Калі шэфскія сувязі ўмацаваліся, узнікла патрэба стварыць спецыяльны атрад. У 1981 годзе па ініцыятыве камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта такі атрад стварылі. Яго задачай была работа з малышамі дзіцячага дома № 2. Жадалі стаць членамі атрада многія, але прымалі толькі тых, хто паказаў сябе ў справе, быў гатовы працаваць выхавацелем. Так атрад у саставе 25 чалавек, першым камандзірам якога была Алена Ліпа, а першым камісарам — Галіна Краўчанка, пачаў свой летапіс.

Прайшло тры гады. Што ж уяўляе сабою атрад «Маладосць» сёння? Чым ён займаецца? Я сустрэўся з камісарам атрада Ірынай Раманенка і папрасіў яе расказаць аб справах свайго калектыву.

— Ірына, раскажы, калі ласка, чым займаўся атрад «Маладосць» гэтым летам?

— Задача ў нас адна — дапамагаць выхоўваць дзяцей з дзіцячага дома № 2. І гэтай задачы наш калектыў аддае ўсе свае сілы і энергію. Летам працавалі ў дзве змены. Безумоўна, было нялёгка. Патрэбна адзначыць, што ў атрадзе выхавацелямі працуюць адны дзяўчаты. І яны выдатна спраўляюцца са сваімі абавязкамі.

Каб быць добрымі выхавацелямі, патрэбна ўмець рабіць усё. Нават у футбол гуляць. Малышам гэта прыносіць вялікае задавальненне. Галоўнае ў нашай справе — прывабіць хлопчыкаў і дзяўчынак да сябе. А зрабіць гэта можна толькі нечым вельмі цікавым і незвычайным.

Хачу расказаць адзін выпадак. Таццяна Лазарэнка трапіла ў складанае становішча. У яе групе было 7 хлопчыкаў і адна дзяўчынка, а затым да яе прывялі яшчэ 13 дзяцей. Уся праблема ў тым, што адным дзецям 7 гадоў, другім — 3. І яны ніяк не маглі знайсці агульных інтарэсаў. А Святлана выйшла з гэтага становішча. Яна арганізавала «каманду карабля». У час гэтай гульні дзеці пасябравалі.

Часта нам даводзілася выступаць у незвычайных ролях. Чыталі казкі, самі іх складалі, былі артыстамі.

Год назад атрад стаў круглагадовым. Зараз не толькі ўлетку мы працуем у дзіцячым доме. У вольны час наведваем сваіх падапечных, займаемся з імі.

Кіраўніцтва дзіцячага дома № 2 засталося задаволеным і зноў запрасіла нас да сябе на будучае лета.

— «Маладосць» называецца атрадам бязвыплатнай працы...

Заробленыя грошы мы пералічваем дзіцячаму дому. Кожны член атрада лічыць гэта сваім абавязкам.

У атрадзе працуюць зацікаўленыя, самаадданыя людзі. Яны аддаюць дзецям часцінку свайго таленту, сваёй душы, свайго сэрца.

І. АДАМОВІЧ,
студэнт факультэта журналістыкі.

● УВАГА: ЗАПРАШАЕМ ДА ДЗЕЯННЯ! ●

Некалькі „За“ НА ФОНЕ НЕРАШУЧАСЦІ

✦ НА ТАНЦЫ ЦІ НА РАБОТУ!

— ПАДКАЖЫ, дзе можна ўладкавацца на работу?

— А хіба ты ўжо больш не вучышся?

— Вучуся, безумоўна. Але ж не ўсе 24 гадзіны ў суткі...

— Усё роўна не разумею. Табе, дарэчы, і з дому дапамагаюць...

— Але колькі ўжо можна адчуваць сябе медалём на бацькавай шыі?!

Сведкай такога вось дыялогу я стаў у адным з пакояў інтэрната ў той вольны ад заняткаў час, калі «літаральна няма чаго рабіць», як сказаў адзін са студэнтаў, удзельнік толькі што пераказанай размовы. Можна запытацца: «Чаму няма чаго рабіць? А дамашняе заданне? А кіно, тэатр? А спартыўныя секцыі, танцы нарэшце?» Студэнт, які сядзеў насупраць мяне, усміхнуўшыся, махнуў рукой:

— Так у мяне на першым курсе і было. Вось лічы: на падрыхтоўку да семінараў і лабараторных дзве гадзіны ў дзень заўсёды хапае. Так? Так. Спортам я займаюся не ў секцыі, а самастойна. Яшчэ гадзіна. Так. Ну а на танцы, у кафэ, кіно або тэатр мы ж нават не праз дзень ходзім. Да таго ж і тут грошы патрэбны. Вось так!

Карацей кажучы, мой субяседнік хутка пераканаў мяне, што ў звычайнага студэнта амаль шэсць гадзін, што называецца, «вылятаюць у трубу». І так штодзень.

— Ты прайдзіся па пакоях. Паглядзі, як бавяцца ў вольны час «людзі, нават цёртыя ў дакладных навуках». Або тэлевізійны экран проглядам праглядаюць, або ў шашкі да самай поўначы рэжуцца, або нагул ляжаць пластом на ложку.

Я не стаў скарыстоўваць гэтую прапанову. Са свайго боку заўважу толькі, што сапраўды не надта падобна на тое, каб пасля заняткаў студэнты толькі і імкнуліся, што ў чыталку, кіно, тэатр або на стадыён.

✦ У ЧЫМ ПРАБЛЕМА?

АДКАЖАМ адразу: у тым, што студэнт не мае права «падрабляць» на тым ці іншым прадпрыемстве. Праўда, агаворымся, юрыдычна такога «няправа» не існуе. Але фактычна... Фактычна ўсё выглядае не так проста, як можа здацца на першы погляд.

Першым, хто стане на шляху студэнта, які вырашыў уладкавацца на работу, будзе дэканат. Аргументы з яго боку старыя, як свет, і, як свет, непахісныя: «Студэнт павінен вучыцца. Дзяржава дае яму такую магчымасць. Больш таго — стыпендыю плоціць. А «падзарабляць» — гэта ўжо нешта па-за межамі звычаяў... І яшчэ невядома, як яно там будзе...»

Так што часцей за ўсё жаданая даведка ад дэканата, у якой бы значылася, што апошні не супраць таго, каб таварыш такі-та працаваў там або там-та, у рукі студэнта не трапляе. Карацей, працаваць або не працаваць — асабістая справа студэнта, на якую дэканат у лепшым выпадку будзе глядзець скрозь пальцы, не забараняючы але і не дазваляючы.

Яшчэ адзін бар'ер — цяжкасці з пошукам здавальняючага месца работы. Пра тое, як іх лепш пазбегнуць, хочацца пагаварыць крыху ніжэй. А зараз назавём яшчэ адно, дастаткова нераспрацаванае «супраць»: непаразуменні пры налічэнні заробку, пытанні з водпускамі і г. д. І галоўнае — чыста маральны бок — працуючы студэнт трапляе ў няёмкае становішча нейкага прасіцеля, які прэтэндуе на нешта, на што ў яго зусім няма правоў...

✦ ВУЧОНЫЯ ДАЮЦЬ «ЗЯЛЁНЫ»

БЯССПРЭЧНА, было б памылковым абсалютызаваць ролю працоўнай дзейнасці студэнт? Пераважная частка энергіі студэнта траціцца зусім не на стварэнне матэрыяльных даброт. Асноўнымі напрамкамі яго дзейнасці з'яўляецца прафесійная падрыхтоўка, фарміраванне грамадска - палітычнай свядомасці. Як бы там ні было, але галоўная праца студэнта — вучоба. Галоўная, але чаму адзіная?

«Мы не верылі б вучэнню, выхаванню і адукацыі, калі б яно было загнана ў школу і адарвана ад бурнага жыцця», — гаварыў У. І. Ленін на III з'ездзе камсамола. Задача ў тым,— падкрэсліваў кіраўнік сацыялістычнай дзяржавы, — каб Камуністычны Саюз Моладзі сваю адукацыю, сваё вучэнне і сваё выхаванне з'яднаў з працай рабочых і сялян, каб ён не запіраўся ў свае школы і не абмяжоўваўся толькі чытаннем камуністычных кніг і брашур».

Звернемся да лічбаў і даследаванняў сацыёлагаў, якія датычаць праблемы працоўнай дзейнасці студэнтаў.

Згодна праведзеных анкетаванняў, дадатковай работай у БДУ імя У. І. Леніна занята прыкладна 11,6 працэнта студэнтаў. Калі ж гаварыць пра жаданне, то ад 40 да 45 працэнтаў студэнтаў выказваюцца за сумяшчэнне работы і вучобы.

Па даных апытанняў для студэнтаў з высокім узроўнем працоўнай актыўнасці характэрны ў асноўным больш высокі ўзровень вучобы. Яны ў большай ступені удзельнічаюць у конкурсах студэнцкіх навуковых работ, навуковых канферэнцыях. Магчыма, для некага гэта і з'явіцца адкрыццём, але рэзультаты сацыялагічных даследаванняў у БДУ пад кіраўніцтвам доктара філасофскіх навук, прафесара Г. П. Давідзюка, прыведзеныя ў кнізе «Студэнт і яго дзейнасць», што выйшла ў 1978 годзе, ён абагульняе наступным вывадам: «Студэнты з высокім узроўнем працоўнай актыўнасці ў параўнанні са студэнтамі з нізкім узроўнем працоўнай актыўнасці характарызуюцца не толькі больш высокай паспяховасцю ў вучобе, але і больш актыўным удзелам у навукова - даследчай рабоце, яны ў большай ступені валодаюць навыкамі самастойнай працы». І крыху ніжэй, разглядаючы працоўную дзейнасць студэнта як адзін з важных элементаў вучэбна - выхаваўчага працэсу ў савецкай вышэйшай школе і як адзін са спосабаў выкарыстання ў эканоміцы краіны дадатковай рабочай сілы: «У выніку працоўнай дзейнасці студэнт мае магчымасць пазнаёміцца з арганізацыяй вытворчага працэсу на прадпрыемстве, з новымі метадамі арганізацыі працы, набыць арганізатарскія здольнасці. І, безумоўна, дзякуючы працы студэнта ствараюцца пэўныя матэрыяльныя каштоўнасці».

Як бачым, вучоныя даюць студэнту на дарозе да работы яркі «зялёны»...

✦ ПЛАН І СТЫХІЯ

А ЗАРАЗ давайце на момант забудзем на «тэорыю» і зойдзем у кабінет начальніка аддзела кадраў хлебазавода № 1 імя 10-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі У. П. Касцючэнкі.

— На нашым прадпрыемстве, па сутнасці, ужо не адзін год дае сябе адчуць праблема рабочых кадраў, — гаворыць Уладзімір Пятровіч. — У такіх умовах мы з ахвотай ідзём насустрач студэнтам, якія шукаюць работу. Тры гады назад мы нават самі разнеслі па некаторых ВНУ аб'явы з запрашэннем да нас на работу. На сённяшні дзень у нас працуюць 36 студэнтаў. Праз тыдзень-другі (размова адбывалася ў пачатку кастрычніка) іх будзе яшчэ больш...

Інжынер па працы В. В. Касцюкевіч пра студэнтаў сказала наступнае:

— Без іх нам было б цяжка. Але цяжкасці пасля таго, як студэнт афарміўся на рабочае месца, далёка яшчэ не канчаюцца. Справа ў тым, што студэнт — гэта «стыхія». Арганізаваць яе не так проста. Здараецца, адпрацаваў чалавек адзін-два дні, не спадабалася яму, і ён... знік. А мы ламаем галаву, што рабіць з новай працоўнай кніжкай, дзе зафіксаваны двухдзённы працоўны стаж. Ці яшчэ прыклад. Работа ў нас зменная, і студэнты звычайна працуюць у начную. Дык вось, чакаем мы вечарам пятнаццаць чалавек, а прыходзіць... пяць. Астатнія адсутнічаюць. Разлік на дадатковыя рабочыя рукі разбіваецца ўшчэнт, натыкнуўшыся на вельмі прыблізнае ўяўленне студэнтаў аб працоўнай дысцыпліне.

Дарэчы, іменна таму многія кіраўнікі прадпрыемстваў не рызыкуюць карыстацца дапамогай студэнтаў нават у крайніх выпадках. Вытворчасць — гэта план. Студэнт — «стыхія». А план і стыхійнасць пад руку не ходзяць.

Гэта зноў жа «тэорыя». А на справе — ходзяць, ды яшчэ як ходзяць! Калі план гарыць...

У. С. Бартошык, майстар хлебнага ўчастка, дзе працуе большасць студэнтаў, паказвае ведамасць: толькі за мінулы месяц на яго стол лягла 41 заява «па асабістаму жаданню». Цякучка амаль 70 працэнтаў. І, тым не менш, з яго слоў:

— Студэнты працуюць добра, старанна... Многія па некалькі месяцаў. Асабліва хачу адзначыць брыгаду хлопцаў з РТІ. Іх шэсць чалавек. Працуюць так, каб чатыры рабочыя месцы заўсёды былі заняты. Надзейныя хлопцы...

Ці не заўважылі вы чаго-небудзь незвычайнага ў выказванні майстра? Не? А як вам здалося гэтае слова — «брыгада»? Як падабаецца яе прынцып работы?

✦ ШТО МОЖА КСА

ДУМАЮ, ШТО хутчэй за ўсё хлопцы з радыётэхнічнага інстытута, якія ўтварылі сваю брыгаду на Мінскім хлебазаводзе № 1, нічога не ведаюць пра тое, што ў Ленінградзе ўжо тры гады ідзе эксперымент па арганізацыі працаўладкавання студэнтаў. Камітэты камсамола ВНУ і абласны штаб СБА, стварыўшы своеасаблівае бюро па працаўкладаванню, узялі на сябе ўсю адказнасць за накіраванне на работу, кантроль за паспяховасцю і вучэбнай дысцыплінай тых студэнтаў, што працуюць. Па іх ініцыятыве на многіх прадпрыемствах і службах (а жаданне супрацоўнічаць са студэнтамі выказалі больш за 400 арганізацый) былі створаны круглагадовыя студэнцкія атрады — КСА, па сутнасці нешта падобнае на брыгаду з РТІ, толькі на больш салідная аснове.

Вопытам дзеліцца студэнт Ленінградскага інстытута авіяцыйнага прыладабудавання Аляксандр Боткін: «Спачатку мы выбіраем прадпрыемства (звычайна па профілю будучай спецыяльнасці), якое можа прыняць атрад. Абгаворваем колькасць рабочых месц, рэжым работы, нормы выпрацоўкі, заключаем дагавор. Тэрміны работы атрада могуць быць самымі рознымі, у залежнасці ад запытаў прадпрыемства: ад аднаго да васьмі месяцаў. Такі парадак дае прадпрыемству гарантаваныя рабочыя рукі, а студэнты могуць працаваць не кожны дзень, лёгка падмяняючы адзін аднаго. І заробак у байцоў КСА звычайна вышэйшы, чым у студэнтаў, якія уладкоўваюцца індывідуальна».

Што ж, падвядзём вынік. Што дало стварэнне грамадскага бюро па працаўладкаванню і арганізацыя КСА?

Па-першае, студэнту зараз ужо не патрэбна «лётаць» па горадзе і перачытваць сотні аб'яў, якія пачынаюцца словамі: «Патрабуюцца...» У бюро яму на выбар прапануюць некалькі месц, дзе ён можа працаваць у вольны ад вучобы час.

Па-другое, шэрагу прадпрыемстваў з дапамогай КСА ўдалося палепшыць кадравае становішча, а значыць, пазбегнуць страт, якія звязаны з прастоем абсталявання.

І па-трэцяе, атрадная форма дазволіла павялічыць ўклад студэнцкай моладзі ў грамадскае жыццё як інстытутаў, так і працоўных калектываў, куды яны прыходзяць пасля вучобы. Лекцыі і палітінфармацыі, шэфскія канцэрты мастацкай самадзейнасці і сумесныя суботнікі — гэта толькі невялікая частка таго, што робяць КСА.

✦ СЛОВА — ЭКАНАМІСТУ

ПА АГУЛЬНАЙ колькасці студэнтаў ВНУ (13 тысяч юнакоў і дзяўчат займаюцца на стацыянары) Магілёўшчына займае другое месца ў рэспубліцы. Разам з тым, дэфіцыт працоўных рук у вобласці таксама адзін з вышэйшых. Магчыма таму іменна тут, а дакладней кажучы, у Магілёўскім аддзеле Навукова - даследчага эканамічнага інстытута Дзяржплана БССР, у кандыдата эканамічных навук К. Надудзіка і нарадзілася ідэя з эканамічнага пункту гледжання абгрунтаваць існаванне КСА.

Ён піша: «Паводле нашых даследаванняў, кожнае рабочае месца ў круглагадовым студэнцкім атрадзе павінна быць замацавана за 2—3 студэнтамі. Працаваць яны могуць па тры-чатыры гадзіны ў дзень дватры разы на тыдзень. Пры такім рэжыме працы, паводле нашых падлікаў, кожны студэнт у сярэднім зробіць 130 выхадаў і адпрацуе ў год 390—430 чалавека - гадзін. У маштабе ўсіх ВНУ вобласці працоўны рэсурс студэнтаў дзённых аддзяленняў складзе 5,2—5,7 мільёна чалавека-гадзін. Гэта велізарны рэзерв! За кошт такога аб'ёму працазатрат толькі ў галінах аграпрамысловага комплексу Магілёўшчыны можна атрымаць прадукцыі на суму 11—12 мільёнаў рублёў у год».

Ну як, уражвае? Мяркую, што так. Але на якім падмурку можна пабудаваць гэты «студэнцкі цэх», каб ён даваў такія прыбыткі?

Вывады магілёўскага эканаміста цалкам супадаюць з практыкай ленінградскіх студэнтаў. «На нашу думку, — піша К. Надудзік, — варта стварыць у кожнай навучальнай установе такую мадэль рабочай кар'еры студэнта, якая дала б яму магчымасць выпрабаваць вялікую колькасць сацыяльна - прафесійных ролей — рабочага на розных аперацыях, брыгадзіра, тэхніка, аператара і г. д. Гэта спатрэбіцца пры рабоце па спецыяльнасці ў будучым. Патрэбна акрэсліць кола прадпрыемстваў, арганізацый і канкрэтных рабочых месц, дзе мэтазгодна шырока выкарыстоўваць студэнтаў - сумяшчальнікаў. Увесь цыкл вытворчых, тэхналагічных і перадыпломных практык студэнтаў неабходна умела спалучыць з работай на вытворчасці.

Думаецца, што пры кожным камітэце камсамола вышэйшай навучальнай установы павінны функцыяніраваць спецыяльныя службы інфармацыі аб рабоце, якая задаволіць студэнтаў».

В. ЧАРНЯЎСКІ,
наш кар.

АД РЭДАКЦЫІ: выказаныя і прыведзеныя карэспандэнтам думкі не пакінуць абыякавымі, напэўна, многіх, і ў першую чаргу камітэт камсамола, штаб працоўных спраў, прафсаюзны камітэт універсітэта. Магчыма, артыкул стане аб'ектам абмеркавання ў акадэмічных групах і дэканатах факультэтаў.

Нам было б цікава ведаць твае меркаванні, чытач. Запрашаем выказацца!

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

● Ва універсітэце 11. 740 чалавек з'яўляюцца членамі спартыўнага таварыства «Буравеснік».

● Рознымі формамі актыўных заняткаў фізкультурай і спортам ахоплена 10.880 чалавек, з іх 5.530 студэнтаў і супрацоўнікаў займаюцца ў спартыўных секцыях.

● На кафедры фізвыхавання і спорту працуе 55 выкладчыкаў, з іх кандыдатаў навук, дацэнтаў — 2, заслужаных трэнераў БССР — 4, майстроў спорту міжнароднага класа — 3, майстроў спорту — 22.

● Два спартсмены універсітэта ўдзельнічалі ў міжнародных спартыўных спаборніцтвах «Дружба-84». Камандар Маджыдаў (юрфак, класічная барацьба) і Галіна Савіцкая (журфак, баскетбол) заваявалі залатыя медалі.

● У гэтым годзе універсітэт заняў 4-е месца на спартакіядзе ВНУ рэспублікі. Паспяхова выступілі зборныя каманды па баскетболу (жанчыны і мужчыны), валейболу (жанчыны), веласпорту, лёгкай атлетыцы, класічнай барацьбе, шахматах.

● За справаздачны перыяд два студэнты універсітэта сталі заслужанымі майстрамі спорту СССР, 5 — майстрамі спорту СССР, 74 — кандыдатамі ў майстры. Падрыхтавана 274 спартсмены першага разраду, звыш 10 тысяч — масавых разрадаў, 5.200 чалавек сталі значкістамі ГПА.

● Звыш 7 тысяч чалавек прынялі ўдзел у круглагадавой спартакіядзе універсітэта, дзе прызавыя месцы занялі юрыдычны, фізічны і механіка-матэматычны факультэты.

● У аглядзе-конкурсе на лепшую пастаноўку спартыўна-масавай работы на факультэтах пераможцамі названы фізічны, юрыдычны факультэты, факультэт радыёфізікі і электронікі.

● У мінулым навучальным годзе паявіліся новыя формы арганізацыі спартыўна-масавай работы сярод студэнтаў: агляды-конкурсы вучэбных груп і інтэрнатаў на лепшую пастаноўку фізкультурна - аздараўленчай і спартыўна-масавай работы.

● Упершыню прайшоў конкурс спартыўных насценных газет факультэтаў, які праводзілі рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» і спартыўны клуб. Лаўрэатамі сталі насценгазеты «Віраж» (факультэт журналістыкі), «Буравеснік» (факультэт радыёфізікі і электронікі), «Геафак спартыўны» (геаграфічны факультэт).

● Універсітэт заняў трэцяе месца ў спартакіядзе супрацоўнікаў ВНУ рэспублікі пасля політэхнічнага інстытута і інстытута замежных моў.

Пятнаццаць падраздзяленняў удзельнічала ў спартакіядзе супрацоўнікаў універсітэта. Агульнакамандная перамога дасталася фізічнаму факультэту, на другім месцы — НДІ ФХП, на трэцім — факультэт радыёфізікі і электронікі.

ЗАДАЧЫ НА БУДУЧАЕ

21 лістапада адбудзецца XV справаздачна-выбарная канферэнцыя спартыўнага клуба універсітэта. Наш карэспандэнт У. АБРАМОВІЧ сустрэўся са старшынёй праўлення спартыўнага клуба А. С. БАЛДЗІНЫМ.

— Анатоль Сяргеевіч, напярэдадні мінулай канферэнцыі Вы адзначылі, што быў зроблены крок наперад і патрэбна працягваць рух, а не спыняцца на месцы. Прайшоў год — можна гаварыць аб рэзультатах...

— У параўнанні з мінулым годам некаторыя паказчыкі нашай работы знаходзяцца на аднолькавым узроўні, а некаторыя — вышэй. Так, значна больш падрыхтавана майстроў спорту і кандыдатаў у майстры, спартсменаў масавых разрадаў.

Універсітэт заняў чацвёртае месца ў спартакіядзе ВНУ рэспублікі, а раней быў трэцім. Праўда, сёлета ў нашай групе выступаў інстытут фізкультуры, які ўпэўнена перамог. Ад прызёраў мы адсталі ненамнога і рэальна прэтэндавалі на месца вышэй.

— Якіх рэзультатаў можна чакаць ад спартсменаў універсітэта ў гэтым навучальным годзе?

— Галоўная задача — увайсці ў тройку прызёраў на спартакіядзе ВНУ рэспублікі. Акрамя таго, чакаем добрага выступлення асобных нашых спартсменаў і зборных каманд. Падставы для гэтага ёсць. Зусім нядаўна на маладзёжным першынстве БССР па класічнай барацьбе В. Каржэль заняў першае месца, а С. Дземяшкевіч быў трэцім. Цяпер яны ўдзельнічаюць у чэмпіянаце сярод дарослых, які праходзіць у Гродна. Дарэчы, разам з імі выступаюць С. Тырсікаў і К. Маджыдаў. В. Ламакіна выйграла маладзёжны чэмпіянат рэспублікі па шахматах. Баскетбалісткі універсітэта маюць намер заваяваць званне чэмпіёнак Беларусі.

Гэта толькі некалькі фактаў, якія сведчаць, што мы можам паспяхова вырашаць пастаўленыя задачы.

— Сёлета на некаторых факультэтах значна актывізавалася спартыўна-масавая работа. Ці выпадкова гэта?

— Агляд-конкурс на лепшую пастаноўку спартыўна-масавай работы на факультэтах назваў новага пераможцу. Ім стаў фізічны факультэт. Юрыдычны факультэт, які два гады запар трымаў першынство, аказаўся другім. Аб прычынах поспеху фізфака патрэбна гаварыць асобна. Але галоўнае — на факультэце пытаннямі фізкультуры і спорту займаюцца не асобныя людзі. Стан развіцця фізкультуры і спорту тут цікавіць партыйнае бюро, дэканат, камітэт камсамола. Тут створаны савет фізкультуры, які ўзначальвае не студэнт, як звычайна, а супрацоўнік. Не дзіўна, што фізікі паспяхова выступілі і ў спартакіядзе студэнтаў — 2-е месца, і супрацоўнікаў — 1-е месца.

Трэцім прызёрам стаў факультэт радыёфізікі і электронікі, які ў апошнія гады пастаянна знаходзіцца ў групе лідэраў.

— Калі глядзіш на вынікі агляду-конкурсу, то ў вочы трапляе тое, што па-ранейшаму нізкі паказчык ў біяфака і гістфака.

— Два «традыцыйныя» адстаючыя — гістфак і біяфак. Калі біяфак адстаючым з'яўляецца ўжо пяты год, то гістфак — другі. Ёсць тут добрыя спартсмены, ёсць людзі, якія маглі б узяцца за працу — няма каму арганізаваць. Фізкультура і спорт на гэтых факультэтах, відаць, цікавяць толькі выкладчыкаў фізвыхавання.

— Анатоль Сяргеевіч, справаздачы, што пішуць старшыні спортбюро і выкладчыкі, амаль не правяраюцца. Таму даныя бываюць завышаныя. А ўсё гэта зніжае ролю агляду-конкурсу.

— Так, бывае і такое. Таму на пасяджэнні новага саставу праўлення спортклуба, які будзе выбраны на канферэнцыі, патрэбна абавязкова вырашыць гэтае пытанне. Патрэбна наладзіць узаемакантроль, як было раней.

На канферэнцыі будуць узняты набалеўшыя пытанні: аб шляхах павышэння майстэрства вядучых спартсменаў, аб паляпшэнні спартыўнай матэрыяльнай базы, павышэнні масавасці правядзення спартыўных мерапрыемстваў ва універсітэце. Пойдзе размова і аб умовах правядзення спартакіяды і агляду-конкурсу.



ЗВЫШ 700 СТУДЭНТАЎ і супрацоўнікаў універсітэта займаюцца ў секцыях спартыўнага ўдасканалення. Секцыі наведваюць лёгкаатлеты і лыжнікі, баскетбалісты і валейбалісты, футбалісты і хакеісты... А сёлета пачалі праводзіць трэніроўкі грабцы на акадэмічных судах. Заняткі ў секцыі па фехтаванню вы бачыце на здымку. Каму не хочацца быць падобным на мушкецёраў! Смеласць, знаходлівасць, волю да перамогі выхоўвае гэты від спорту. Дарэчы, як і ўсе астатнія з 25 відаў, што культывуюцца ва універсітэце.

● НАПЯРЭДАДНІ ЗІМОВАГА СЕЗОНА ●

СТАЛІ ПРЫЗЁРАМІ

ПРАДСТАЎНІКІ зімовых відаў спорту ніяк не могуць дачакацца, калі выпадзе першы снег. А пакуль мы, лыжнікі, спаборнічаем на лыжаролерах, у агульнафізічнай падрыхтоўцы. Нядаўна адбыліся спаборніцтвы па агульнафізічнай падрыхтоўцы і кросу сярод ВНУ рэспублікі.

Другакурснік фізічнага факультэта Юра Татульчанка прабег 100 метраў за 13,0 секунд, падцягнуўся 21 раз... І толькі няўдача ў кросе не дазволіла Юру падняцца вышэй трэцяга месца. Але і гэты рэзультат для юнака, які толькі другі год займаецца лыжным спортам, — несумненны поспех. У хлопцаў малодшай групы выдатна выступіў студэнт юрфака Аляксандр Таргонскі. Ён быў чацвёртым і паказаў добры вынік у асноўным відзе спаборніцтваў — кросе на 6 км — 21 мінута 30 секунд.

Свае надзеі мы звязваем і з пешакурснікам юрыдычнага факультэта Валерам Ждановічам, які пакуль заняў толькі дзевятае месца.

Дзяўчаты выступілі вельмі роўна, амаль усе трапілі ў лепшую дзесятку і прынеслі камандзе заліковыя ачкі. Сярод іх Лена Капылова (юрфак), Лена Чэпік, Ларыса Баркова, Света Сяргеева (гістфак), Лена Лукашэвіч (мехмат).

У спаборніцтвах удзельнічалі і школьнікі, якія займаюцца ва універсітэцкай секцыі. Яны паказалі нядрэнныя вынікі.

Каманда універсітэта заняла агульнае другое месца, зрабіўшы тры крокі наперад у параўнанні з мінулым годам.

А. ДАНІЛЬЧАНКА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

ЗЛЁТ АЛЬПІНІСТАЎ

...Я ЎЖО хацела павярнуць назад, як раптам убачыла плакат, дзякуючы якому адразу вызначыла, што гэта лагер, у якім павінен праходзіць традыцыйны злёт альпіністаў. Здагадку пацвердзіў нейчы моцны голас, што далятаў здалёку: «Калі вы не пойдзеце, то шмат страціце». Так, я не памылілася. Гэта былі сапраўды спаборніцтвы альпіністаў, якія праходзілі ў канцы кастрычніка на восьмым кіламетры ад чыгуначнай станцыі Аляхновічы.

Хоць Памір не побач...

Спаборніцтвы былі ў разгары. Пакуль ішлі прыгатаванні да наступнага тура, я пагутарыла са старшынёй секцыі альпінізму універсітэта выпускніком фізічнага факультэта Андрэем Карцавым. Ён расказаў, што ў спаборніцтвах прымаюць удзел дванаццаць каманд (па шэсць-сем чалавек у кожнай). У іх саставе не толькі студэнты нашага універсітэта, але і запрошаныя на злёт навучэнцы іншых ВНУ горада. Напрыклад, у спаборніцтвах па начному арыентаванню першынство заваявала каманда Мінскага медыцынскага інстытута.

— Хутка рабят чакае ўзыходжанне на горы Каўказа, — гаворыць Андрэй. — Гэта нялёгка. Але секцыя старанна рыхтуецца да паходу. Тут чалавек усебакова развіваецца, вучыцца цаніць дружбу, становіцца мужным.

Але нашу размову перапыніла музыка: пачаўся наступны тур. Ён быў некалькі незвычайны для спартыўнага мерапрыемства. Аднак ужо сама назва—«Дэманстрацыя мадэлей альпінісцкага аддзялення-84» — прыцягнула агульную ўвагу.

На злёце была паказана шырокая гумарыстычная і музычная праграма. На тварах удзельнікаў зззялі усмешкі, і з усіх бакоў сыпаліся жарты. Любы спартыўны трук абавязкова суправаджаўся жартоўнай песняй, словы якой адпавядалі характару дзеянняў альпініста.

— Гэта незвычайна, а значыць цікава, — сказаў студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі Уладзімір Данілеўскі, выказаўшы тым самым думку ўсіх удзельнікаў злёту.

Зразумела, самае вялікае ўражанне пакінулі спаборніцтвы. Уявіце сабе шырокую раку са стромкімі берагамі, з абодвух бакоў якой растуць дрэвы. Гэта — нядрэннае месца для трэніроўкі альпіністаў. Цераз рэчку нацягваюць два канаты (адзін над другім) і замацоўваюць іх на ствалах дрэў. Каб трапіць на другі бераг, патрэбна ісці прыстаўнымі крокамі па ніжняму канату, трымаючыся рукамі за верхні. Маючы дастатковую трэніроўку, гэта можна выконваць і без страхоўкі. Маючы толькі адну вяроўку, патрэбна карыстацца спецыяльным металічным мацаваннем. У выкананні гэтых і больш складаных элементаў і спаборнічалі спартсмены. Пераможцай стала каманда механіка-матэматычнага факультэта. Узорам спрыту і сілы былі Алена Пекар і Алена Зянкевіч (журфак), Уладзімір Картыннік (ФПМ).

З вялікай радасцю пасля складаных спаборніцтваў альпіністы ўдзельнічалі ў конкурсе на лепшае прыгатаванне бутэрбродаў. Тут лепшымі былі студэнты медыцынскага інстытута.

Застаўся апошні тур конкурсу — збор палатак. У гэтым конкурсе дзякуючы таму, што спяшацца не было куды — да электрычкі заставалася дастаткова часу, — каманды сталі дапамагаць адна адной. І перамагла дружба.

А. МАСЬКОВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

15 лістапада 1984 г.

Зак. 1827. АТ 10528

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ